# Сказ. Тыпы сказаў

**1. Ахарактарызуйце сказы паводле мэты выказвання і эмацыянальнай афарбоўкі. Растлумачце знакі прыпынку ў канцы сказаў.**

Англічанін увесь час сачыў за Андрэем. Той быў у думках вельмі далёка. У душы ў яго расло, спела жаданне ўпасці вось тут на калені і заплакаць. Ён, бадай што, і зрабіў бы гэта, каб быў адзін, каб не было паблізу нікога. “Родная, дарагая зямелька, як ты ўсё ж цягнеш да сябе людзей, дзе б яны ні былі! І няўжо гэта праўда, што я страціў цябе? Няўжо праўда, што згубіў назаўсёды, навечна? Даруйце мне, мае дарагія мясціны. Даруй мне, любая зямля.”

– Я не хадзіў тут больш за дзесяць гадоў! – прамовіў Андрэй летуценна. – Больш за дзесяць гадоў не ступала тут мая нага! – і, павярнуўшыся тварам да англічаніна сказаў: – Пачакайце мяне, містэр Фостэр, я трохі прайдуся.

– І не паверыш, што тут некалі быў наш двор, жылі мае бацькі, жыў я, – задуменна прамовіў Андрэй. – Што робіць час?!

(Б.Сачанка)

**2. Растлумачце структуру і значэнні пытальных сказаў (уласна пытальныя, пытальна-рытарычныя, пытальна-пабуджальныя).**

1. Побач шаша, горад. Хіба яны чакаюць партызан са стэпу? (Р.Няхай). 2. Ваня, што з табой? Чаму ты такі змрочны? (А.Карпюк). 3. Зоркай іншага сусвету бліснуў кляновы ліст. Адкуль ён зляцеў? (І.Шамякін). 4. Нашто дарэмныя гэтыя журботы? Не клапаціцеся. (У.Караткевіч). 5. Дзе яшчэ так шчыра любяць песню? (А.Кудравец). 6. “Змоўкнеш ты ці не?” – злосна крыкнуў Міхал. (К.Чорны). 7. Куды вам ехаць? Начуйце. Коні адпачнуць пасля такой дарогі. (А.Пальчэўскі). 8. Хіба ж не любавацца сваім прыгожым краем?! (Янка Купала). 9. Чаму, адкуль ідзе гэта няёмкасць і сарамлівасць за сваё блізкае і роднае? Адкуль у чалавеку сляпая ўпэўненасць, што чужое і далёкае нашмат лепшае? (В.Гігевіч). 10. Стрэлу не было. Трывога паранейшаму гняла грудзі. Быў хто там ці не быў? Няўжо толькі здалося? Ён жа добра бачыў: постаці, рухі нават!... Чаму ж не стрэлілі? Пабаяліся ў апошні момант? (І.Мележ). 11. – Добры дзень, малады чалавек! Вы таксама пісьменнік? (Я.Брыль). 12. Хіба можам мы праехаць міма, не наведаўшы адну з найбуйнейшых будоўляў рэспублікі? (В.Вольскі). 13.Можа наведалі б нас калі-небудзь?” – “Хутка, хутка прыедзем,” – у адзін голас адказалі хлопцы (М.Лынькоў). 14. Паэт мой, чаго ты на поўдні не бачыў – айвы кіславатай, шакалаў ці кобраў, багатых пярсцёнкаў ці слёзаў жабрачых? (П.Панчанка). 15. А чые гэта нівы аж гнуцца пад цяжкім налівам? (М.Лужанін). 16. “А хто там ідзе, а хто там ідзе ў агромістай такой грамадзе?” – “Беларусы” (Янка Купала).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Спішыце сказы, ставячы ў канцы іх патрэбныя знакі прыпынку. Адказ матывуйце.**

1. Выпадковасць, бязглуздзіца больш творацць жыццё, чым асэнсаванасць (В.Казько) 2. – О – го – го, брат – дзядзька кажа: -- Цяпер зіма напэўна ляжа (Якуб Колас) 3. Што за стан яе дзявочы Ўсё аддам, каб прыгарнуць Ну, а вочы… Бачыў вочы Так і хочацца нырнуць (П.Панчанка) 4. Ты чуеш, дружа, як плачуць журавы над зарывам асенніх журавін (П.Панчанка) 5. Поўдзень, або Палессе лічаць адной суцэльнай забалочанай нізінай (У.Караткевіч) 6. Усе рэкі Беларусі належаць да басейнаў двух мораў: Чорнага і Балтыйскага (У.Караткевіч) 7. Не хочуць маладыя мець многа дзяцей А якая ж будучыня без дзетак (Л.Левановіч) 8. Па якім прынцыпе кладзецца на сценкі роспіс (У.Ягодзік) 9. Як ты дорага мне, мая родная мова – песні-долі маёй векавая аснова (Н.Гілевіч) 10. Ці чулі вы зязюлі кукаванне ў глыбокіх сутоннях лясных (А.Пысін) 11. Ільняное белае адзенне спадарожнічала беларускаму селяніну ад нараджэння да канца жыцця (М.Раманюк) 12. Цёпламу яснаму дню радуецца кожная жывая істота (І.Навуменка) 13. Хіба ўвосень не расцвітае прыгажуня-яблынька, зведзеная ў зман здрадлівай ласкай бабінага лета (І.Навуменка) 14. Ніколі не спыняйцеся на паўдарозе (Якуб Колас) 15. Ой ты, маё сонца, як жа свеціш ясна (Янка Купала) 16. Што ж мне можа быць больш за Радзіму любімую міла (П.Панчанка)

**4. Падзяліце тэкст на сказы. Пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку.**

Даўняй любоўю люблю вясну яшчэ не агоркне бярозавік, а ляшчына з вольхаю пазасыпаюць лужыны ці не па ўсёй пушчы і тут з наіўнасцю дзетак пазіраюць на ўсё гэта сінія вочы пралесак то там, то тут яны, нібы невялічкія азёрцы, адлюстроўваюць блакіт неба але ў нас ёсць не толькі блакітныя ці сінія пралескі часам трапляюцца ружовага, нават белага колеру дзіва дый годзе

Я заўсёды бягу ў пушчу па вясну адшукаю кветкі, укленчу, але яны пазіраюць так даверліва, так па-дзіцячы, што рука не адважыцца сарваць наіўна толькі іначай не магу…

Цвіце пушчанская зямля і зімою… глуха шуміць лес, апусцеюць лугі і палі, а я жыву надзеяй, што прыйдзе адліга і яна прыходзіць тады бачу: зацвітаюць кветкі у агародчыку ўспыхваюць драбнюткія зорачкі макрыцы, мініяцюрныя фіялкі-браткі, кветкі стрэлак… стукне мароз - заледзянеюць кветкі а прылашчыць сонейка – і быццам зіма не зіма для іх: зноў цвітуць ажываюць да апошняй жылачкі… мужнасць? так дакладней, сімвал неўміручасці, стойкасці, мужнасці нахіляюся над імі заўсёды, як у паклоне…

(Я.Пархута)

**5. Вызначце тыпы сказаў паводле адносін выказвання да рэчаіснасці (сцвярджальныя, адмоўныя: агульнаадмоўныя, прыватнаадмоўныя).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Лейтэнант не мог, проста не меў права траціць дарагі час на пошукі або чаканне (В.Быкаў). 2. На Палессі, на самым поўдні Беларусі, ёсць куточак зямлі, асабліва мілы, дарагі майму сэрцу (Б.Сачанка). 3. Над суседнімі дубамі і бярозамі ўзняўся вялізны і стройны дуб. Нельга не зачаравацца, гледзячы на гэты велічны помнік нашай прыроды (Т.Хадкевіч). 4. Не люблю я слова “пакарыцель”, не люблю я слова “ўладар”, вось зямля зялёная – бярыце для жыцця, і працы, і для мар (П.Панчанка). 5. Чаго толькі не перадумаеш ідучы? (Якуб Колас). 6. “А ці не пахне тут правакацыяй?” – нарастала ў Заслонава ўсё больш і больш трывога (М.Лынькоў). 7. У маленькай глухой вёсцы я пачынаў свой настаўніцкі шлях. На ёлцы гарэла не семдзесят лямпачак, як сёння, а дваццаць пяць свечак (А.Пальчэўскі). 8. Не кожнай песні выпадае шчаслівы лёс (П.Прыходзька). 9. Кожны чалавек за сваё жыццё дорыць вечнасці хоць адно кругасветнае падарожжа (Я.Сіпакоў). 10. Роднае слова з’яўляецца самай прыкметнай адзнакай нацыянальнай прыналежнасці чалавека (А.Крывіцкі). 11. Я вяртаюся ў тое радаснае і незабыўнае свята, калі да нас, пасляваенных падлеткаў, прыходзіў на стол хлеб. Не з крамы, як зараз, а са звычайнай задымленай вясковай печы, спечаны часам не ў формах, а ў салдацкіх касках (М.Чарняўскі). 12. Можа, я праз хвіліну памру за радзіму, але, гэтак памёршы, не жыць не магу (М.Лужанін). 13. Пра тое, як узніклі многія падпольныя арганізацыі, мы, на жаль, ведаем пакуль што не ўсё (Б.Сачанка). 14. Таго ніколі не пакіне юнацкі, вечна весні ўздым, хто аддае, як дар краіне, жыццё да рэшты – маладым! (Н.Гілевіч). 15. Не ты, а я ў балоце ляжаў асенняй золлю, у ледзяной рудаўцы, скалелы да касцей (Н.Гілевіч). 16. Не ў асаблівым розуме, не ў фізічнай сіле, не ў прыгажосці моц чалавека. Значэнне яго – у мэце, у велічы сэрца, у сутнасці імкненняў (А.Карпюк).

**6. Спішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку. Вызначце тыпы сказаў паводле граматычнай структуры (простыя, складаныя). Падкрэсліце ў сказах прэдыкатыўную аснову (дзейнік і выказнік).**

Культ песні, музыкі і паэзіі ўсеўладна панаваў у доме Рыгора Раманавіча Шырмы. Часта паслухаць новыя творы збіралася надзвычай шырокае кола знаёмых, сяброў. І гэта не дзіва. Ён не толькі сам у нястомных пошуках народных песенных скарбаў і самародных талентаў прайшоў усю Заходнюю Беларусь, як потым і ўсю нашу краіну, але і ўся Беларусь прайшла праз яго гасцінны парог, праз яго шчырае сэрца.

Ён валодаў зайздросным дарам згуртоўваць вакол сябе моладзь, абуджаць яе веру ў свае сілы, здольнасці, веру ў лепшую будучыню. У яго доме заўсёды можна было застаць то гімназістаў, якія прыходзілі са сваімі клопатамі, то студэнтаў, якія часта збіраліся на рэпетыцыі хору, якім кіраваў Рыгор Раманавіч, то розных хадакоў і землякоў, якія прыходзілі па кнігі, за парадамі, то пачаткоўцаў – паэтаў, спевакоў, музыкантаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Любоў да сваёй роднай беларускай песні спалучалася ў Рыгора Раманавіча з глыбокім разуменнем яе значэння ў развіцці культуры народа, ва ўмацаванні братэрскіх сувязей паміж народамі. Ён лічыў, што народ, які перастаў спяваць, перастаў і жыць. І ён, не шкадуючы сіл і здольнасцей, рабіў усё, каб песня абуджала нацыянальную свядомасць нашага народа, клікала яго да барацьбы за лепшую будучыню і, як прадвеснік перамогі, свабоды, магутнай ракой плыла ў шырокі славянскі свет. Сёння Шырма – гонар беларускага народа і ўсёй нацыянальнай культуры.

(М.Танк)

**7. Спішыце сказы. Вызначце, двухсастаўнымі ці аднасастаўнымі з'яўляюцца яны. Падкрэсліце ў сказах граматычную аснову.**

1. Добра ў лузе ў час палудны! Лёгка там дыхнуць! Хмаркі белыя марудна за лясы плывуць (Якуб Колас). 2. Другі тыдзень запар ідзе дождж. Цярушыць і цярушыць, быццам праз сіта. А то часам і ветрам пацягне, такім непрыветным, што пальцы пачынаюць дубець (Р.Ігнаценка). 3. Дзень быў ясны, цёплы. Нават на цельшынскай вуліцы падсохла. Сяляне з сохамі, з каробкамі і мяшкамі з аўсом выязджалі на поле (Якуб Колас). 4. Харошы ў Дабрасельцах лес. У гэтую зіму ён іншы раз падобны на казку. Можна прывесці сюды малых дзяцей і расказаць ім пра розныя цуды на зямлі (А.Кулакоўскі). 5. Пачынала світаць. Дрэвы насцярожана драмалі, гледзячы ў празрыстую, чыстую, як шкло, ваду, пакрытую лёгкім вэлюмам туману (У.Дамашэвіч). 6. Жыты ўжо адкрасавалі. Ужо нават не чутно было іх ледзь улоўнага, найтанчэйшага паху (А.Ліс). 7. Папараць жоўтая, буланая, а месцам чырвоная, як агонь. Яна шорсткая пасля зімы. Ад сухой папараці патыхае сухім дрэвам (І.Пташнікаў). 8. Дол быў услаены рудым лісцем, доўгаю травою, друзам збуцвелых галінак (У.Дамашэвіч). 9. На дварэ пахла гуркамі і кменам (І.Пташнікаў). 10. Творчасць – найбагацейшая крыніца радасці (А.Карпюк). 11. У цьмяным небе, нізкім, навіслым, рэдка і скупа мігцелі зоркі (І.Пташнікаў). 12. Толькі ў ціхія ночы пад раніцу рабілася свежа і сыра (І.Пташнікаў). 13. Маё вялікае і даўняе жаданне – ва ўсім будзённым бачыць урачыстасць (Я.Сіпакоў). 14. Селянін, складаючы песні, часцей за ўсё сваю нават самую цяжкую працу ўмеў ператварыць у радасць (Я.Сіпакоў). 15. Ужо няма ні сіл, ні жадання разгадваць гэтую таямніцу (В.Гігевіч). 16. Зараз думаецца ўсё ясна і проста (В.Гігевіч).

**8. Згрупуйце сказы наступным чынам: а) двухсастаўныя развітыя; б) двухсастаўныя неразвітыя; в) аднасастаўныя развітыя; г) аднасастаўныя неразвітыя.**

1. Развіднела. А певень людзей не будзіў (П.Панчанка). 2. Заззялі зоры (П.Броўка). 3. Бацькоўскае слова – не вецер (Я.Брыль). 4. Прыгожая песня, задушэўная, мілагучная (В.Вітка). 5. Вось і дуб. Колькі ж гэта вякоў ён вартуе Свіцязь? (Я.Пархута). 6. Полудзень. Спёка. Чарада авечак збілася ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гурты (І.Грамовіч). 7. У чужой царкве свечак не папраўляй (Прыказка). 8. Нарач. Сонца на захадзе зірнула з-пад хмар. І хвалі неяк адразу сцюдзёна, нявесела заблішчалі пад чорнай сталлю нізкага неба (Янка Брыль). 9. Прайшлі гады (П.Броўка). 10. Зіма, зіма… Бы ў цвеце ліпа, у белым снезе ўся зямля (П.Глебка). 11. Мінула ноч (С.Грахоўскі). 12. А гэта – возера Доўгае (В.Вольскі). 13. Вось і лес. Цёпла пад снегам маленькім елачкам (Я.Брыль). 14. І вось яму далі слова. Стала ціха (І.Грамовіч). 15. Маці прыйшла стомленая (Р.Няхай). 16. Не старэйце, людзі, дачасна, нараджайцеся кожны дзень (П.Панчанка).

**9. Выпішыце з тэксту ўскладненыя сказы. У дужках укажыце, якімі канструкцыямі яны ўскладнены (аднародныя члены сказа, адасобленыя члены сказа, звароткі, параўнальныя звароты, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі).**

Шчасце – гэта заўсёды нешта недасягальнае. Яно – толькі наперадзе. І калі ты дасягнуў, дамогся таго, чаго так ужо няўсцерпу чакаў, – табе робіцца вельмі ж радасна, і ты, задаволены і зняможаны, лічыш, што гэта і ёсць шчасце.

А пройдзе час, і зноў заўважаеш, што гэта шчасце блякне, робіцца будзённым жыццём, а ты, нудзячыся ад яго, пачынаеш сумаваць і тужліва чакаць нечага такога, што яшчэ наперадзе, што непазнана, як музыка, турбуе цябе і прымушае шчымець сэрца. Шчасце – гэта не тое, чаго ты дасягнуў. Відаць, шчасце нельга ўзяць у рукі і разгледзець, бо шчасце – гэта заўсёды лінія гарызонта: а на яе не наступіш нагою.

Гэта проста радасць. Радасць чалавека, якому ўсё ж сяды-тады не шкодзіць пабыць толькі сам-насам з сабою. І яшчэ – з цішынёю.

Але і пастаянна чалавек таксама не можа жыць у радасці, бо той, хто ніколі не ўведаў, што такое расчараванне, сум, боль, сумненне, мусіць, не можа быць ні радасным, ні, тым больш, шчаслівым: адкуль яму будзе знаёма тая змена настрояў – ад балючага да прыемнага, – якая, можа, ужо сама па сабе і ёсць радасць.

Кожны бачыў, як узыходзіць сонца, – а гэта ўжо радасць; кожны ведае, як пачынае варушыць зямлю расток, – гэта таксама радасць; кожны чуў, як шумліва перагаворваюцца паміж сабою дрэвы і пераспеўваюцца птушкі, – і гэта таксама радасць. Ды яшчэ якая!

А я ж яшчэ бачыў вясёлку над лугам, напалоханым толькі што адшумелым ліўнем-навальніцаю. Бачыў, як лопаецца пупышка, чуў, як крэкча мурашка, напінаючыся над ігліцаю. І хто можа сказаць мне, што я не ведаў радасці?

Да таго ж і чаканне радасці – само па сабе ўжо радасць…

(Янка Сіпакоў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**10. Выпішыце спачатку поўныя, затым няпоўныя сказы. Вызначце, якія структурна неабходныя члены сказа прапушчаны ў няпоўных сказах. Чым абумоўлена непаўната сказаў?**

I. Васіль з дзяцінства быў грыбнікам. Ведаў, дзе растуць у лесе баравікі: у сасонніку, паміж моху, – чорныя; на ўскрайках або каля лясных дарог – з карычнева-жоўтымі шапкамі або зусім бялявыя (Л.Дайнека).

II. – Хто яна? – пошапкам пыталіся адзін аднаго людзі. Усе пацiскалі плячыма, і толькі адна жанчына патлумачыла слухачам:

– Настаўніца. Беларускую мову выкладала… (М.Даніленка).

III. Паціхеньку адчыняюцца дзверы. Уваходзіць дырэктар. Ён здзіўлена пытае ў настаўніка:

– Вы яшчэ тут, Анатоль Пятровіч?
– Як бачыце, Мікалай Сямёнавіч.
– Урокі даўно скончаны. Хіба вы не чулі званка?
– Чулі. Толькі мы ніяк не можам скончыць свайго ўрока (А.Пальчэўскі).

IV. Цяпер ў мяне з’явіўся прыемны клопат: я памагаў вярнуць жыццё будучым дрэўцам. Кожнай раніцы спяшаўся перш-наперш зірнуць, як маюцца выхаванцы, што сталася з імі за ноч (А.Пальчэўскі).

**11. Прачытайце. Знайдзіце няпоўныя і аднасастаўныя сказы. Назавіце іх тыпы.**

1. Смачна спіцца на пухкім сене (П.Панчанка). 2. Сядзім над Дняпром. Сонца набліжаецца да гарызонту. На дрэвах, на вадзе, на гліне адхонаў аранжавы водбліск (У.Караткевіч). 3. Бульба. Яна паўсюль, яна – універсал (У.Караткевіч). 4. Эме Міхайлаўне сорак год. Была двойчы замужам (В.Гігевіч). 5. Колькі жыцця пад вусатым калоссем! Ляжаш наўпоперак мяжы, залезеш з галавой у жыта, прыціхнеш і слухаеш(Я.Брыль). 6. Перад намі бязмежны прастор (Якуб Колас). 7. Гуслям, княжа, не пішуць законаў (Янка Купала). 8. Бывайце здаровы, лясы і дубровы (І.Дуброўскі). 9. Некалькі круглых градак з кветкамі і нядаўна пасаджаныя два клёнікі (К.Чорны). 10. Першая зорка ў вышыні. Празрыста-сіняе неба над густа-сіняй зямлёй (У.Караткевіч). 11. Поўдзень. Палескае роўнае поле. На гарызонце зубчасты сілуэт лесу (У.Караткевіч). 12. Вяселле справілі як мае быць (У.Корбан). 13. Каціўся верасамі вясельны каравай: – Ой, дзеўка, абрусамі застолле накрывай (Р.Барадулін). 14. Сабаку далі па хвасце, і гонар вылез яму бокам (К.Крапіва). 15. Ноч. Дванаццатая гадзіна. Паўшар’е парыпвала воссю сухой (Р.Барадулін). 16. – Хто адказваў? – Сусед па парце (Я.Маўр).

**12. Знайдзіце сінтаксічна непадзельныя сказы, вызначце тып і форму іх выражэння.**

1. “Мікола, чуеш?” – “Ага,” – ціха адказаў ён і нават не варухнуўся (Я.Пархута). 2. “А ў вас і чыгунка ёсць?” – “А як жа! І порт у дадатак. Канал

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ад ракі праклалі…" (Я.Пархута). 3. "А-я-яй! А мне думалася, што балота нашыя адкрылі. А яно вунь як… Глядзі ты… І чыгунку пры вас насыпалі?" – "Не. Яшчэ да маёй памяці" (І.Навуменка). 4. "Ну? – не сціхаў усё Пшанічны, звяртаючыся да насцярожаных прымоўклых людзей. – Што?" – "Што ты нукаеш? – злосна азваўся Свіст. – Дзе старшына?" (В.Быкаў). 5. "Ну і што ж? Ты яго панясеш, параненага? А?" – "А што ж, пакінуць?" – "Ну. Вядома. Пакінуць – дрэнна. Але іншага выйсця няма" (В.Быкаў). 6. "Ну во!" – ужо звяртаючыся да мяне, прамовіў чалавек у капелюшы (Я.Пархута). 7. "Чаго сталі? Бярэм! Чаго чакаць? Ну!" (В.Быкаў). 8. Наўрад ці ведала яна [Джулія] гэтае хлапчукоўскае слова, але цяпер настолькі суладнымі былі іх пачуцці, што яна згодна падхапіла: "Айда! Айда!" (В.Быкаў). 9. "Баста, Іван!" – прамовіла Джулія, не паднімаючы галавы. Ён [Іван] памаўчаў. "Як гэта баста? А ну, уставай! А ну, падымайся! Яшчэ трошкі – і перавал. А ўніз ногі самі пабягуць" (В.Быкаў). 10. "Э-эх, хлопцы, без геаметрыі, як без рук" (І.Навуменка). 11. "Адкуль дазналіся пра мяне, што жыву яшчэ, што памятаю тыя паганыя дні?" – "Уведаў. Ад людзей". – "Ага. Людзі ўсё помняць!" (Я.Пархута). 12. "Не-е-э! – запратэставаў Іван. – Хочаце маім пальцам ды ў маё ж вока" (І.Навуменка). 13. "Ну вось табе і на!" – ледзь не вырвалася ў Сяргея (У.Шахавец). 14. "Што-о-о?" – "А то! Камбат мне нічога не загадваў. От! Я Люсі не казаў. Што вы нарабілі тут – не мая бяда. Я ўбаку" (В.Быкаў). 15. "Вон! Вон, здраднік! Вон!" (У.Караткевіч). 16. "Цыц! Не хапала яшчэ, каб папы пабіліся" (У.Караткевіч).

**13. Зрабіце аналіз простых сказаў у наступнай паслядоўнасці:** ***1) сказ паводле мэты выказвання (апавядальны, пытальны, пабуджальны); 2) сказ паводле эмацыянальнай афарбоўкі (клічны ці няклічны); 3) сказ паводле адносін выказвання да рэчаіснасці (сцвярджальны ці адмоўны); 4) сказ паводле граматычнай структуры (двухсастаўны ці аднасастаўны, развіты ці неразвіты, няўскладнены ці ўскладнены. Ускладнены: аднароднымі членамі сказа(дзейнікамі, выказнікамі, дапаўненнямі, азначэннямі, акалічнасцямі), адасобленымі членамі сказа (азначэннем (прыдаткам), акалічнасцю, дапаўненнем, далучальным членам сказа), звароткам, параўнальным зваротам, пабочнымі ці ўстаўнымі канструкцыямі); 5) сказ поўны ці няпоўны; 6) сказ сінтаксічна падзельны ці непадзельны.***

Непрыкметна сплыло па Бярэзіне лета, і на змену сімфоніі гукаў і фарбаў прыйшоў спакойны настрой восені. Першыя маразы пафарбавалі лістоту. Яна зрабілася яркай і кідкай. Во як на тым беразе гарыць бярэзінка! І асінка палыхае ад чырвані. Лазнякі таксама ўспыхнулі, нібы хто пазалотай пакрыў іх. Дуб стаіць у густым бурым уборы. А побач вярба кучаравіцца. Яе нібы не крануў ні волкі туман, ні калючы прымаразак.

Рака стараецца ўвабраць колеры восені, а не можа – вада зрабілася цяжкай, страціла здольнасць адлюстроўваць. І толькі ў затоцы, што падступае да гэтага берага, нешта зелена паблісквае. Няўжо лісце белых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гарлачыкаў? Яны! Быццам вялікія патэльні, цямнеюць лісты на халоднай вадзе.

А што там, у самым кутку затокі? Ці не бабровая хатка? Вунь колькі ламачча нацягаў! Бабру там добра. Вербалоз – побач. Сячы, колькі трэба, рыхтуйся да зімы, тралюй да хаткі. І ён тралюе. Бо чаго кругі па вадзе ідуць? Здаецца, пачакай трошкі – і ён з'явіцца на беразе, зірне на цябе цікаўным вокам, потым зноў зойдзе ў ваду, плясне па ёй шырокім хвастом і пагоніць перад сабою чарговую галіну.

Працуй бабёр! Цёпла і ярка гары ліст на прыбярэжных дрэвах! І ты, сарока, супакойся на верхавінцы вольхі! Запаведная мясціна не любіць, калі яе трывожаць…

(Я.Пархута)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ